Сяргей Зянкевіч



...нічога добрага, нічога трывалага
нідзе і ніколі не пабудуеш на хлусьні...

# «Той, хто саджае на палю»,

***альбо Вандроўка ў край графа Дракулы***

Мне вельмі падабаецца Румынія. Падабаюцца самі румыны, падабаецца адпачываць у гэтай краіне, наведваць гарады і музеі. Там ёсьць мора, а гэтага Беларусь, на жаль, ня мае. Там расьце вінаград, з якога выробляецца цудоўнае віно. Але самае галоўнае для майго душэўнага камфорту — там ніхто не размаўляе па-расейску. Ну не разумеюць там расейскай мовы!.. У гэтым сэнсе Румынія адрозьніваецца ў лепшы бок ад Балгарыі, дзе ў апошнія гады (да ўвядзеньня візавага рэжыму) у месцах адпачынку немагчыма было прайсьці, не пачуўшы расейскае мовы. У маёй балгарскай, на жаль, акцэнт прысутнічае. Неабходнасьць увесь час тлумачыць, што ты не расеец, даводзіла мяне да шаленства. А тут – не, тут за расейца ніхто не прымае. З нагоды акцэнту могуць запытаць: “Republica Moldova?”. На што я з гонарам адказваю: “Nu, Republica Belarus!” А яшчэ тут ніхто ня зьвернецца да цябе на “ты”, і не абзаве “мужыком” ці “таварышчам”. У Румыніі зьвяртаюцца адзін да аднаго “domnul” (ад лацінскага dominus — бог, гаспадар).

“Таварышчы” тут скончыліся разам з Нікалае Чаўшэску ў 1989 годзе.

Упершыню думка напісаць пра свае румынскія ўражаньні прыйшла ў галаву пасьля прачытаньня артыкулу “Найвялікшыя садысты сьвету”. Там быў зьмешчаны партрэт Улада Цепэша пад назваю “Улад Валашскі”. Гэты чалавек больш вядомы як Улад Дракула. Паколькі я ўжо наведваў Румынію ў 2001 годзе, то згадаў, дзе гэтыя партрэты бачыў і дзе пра гэтага чалавека чуў. Партрэты Улада Цепэша можна пабачыць у любой румынскай бібліятэцы побач з партрэтамі Штэфана Вялікага, Міхая Храбрага, Міхая Эмінэску.

Як жа так? З аднаго боку — садыст, з іншага боку — нацыянальны герой?

Захацелася разабрацца, што ж гэта за дзеяч такі. І я вырашыў праехаць па ўсіх тых, як казалі ў маім дзяцінстве, “памятных местах”, каб уведаць: хто ж ёсьць Дракула. І вось турысцкі аўтобус едзе ў накірунку Румыніі.

## *1. Улад Цепэш.*

Румынія гістарычна складалася з трох рэгіёнаў: Валахіі, Трансільваніі, Малдовы. Улад нарадзіўся ў 1431 г. ў Сігішаары – Трансільванія. Яго бацька паходзіў з дынастыі, якая кіравала Валахіяй з пачатку XIV стагоддзя. Бацька Улада Цепэша — Улад I (гаспадар у 1436-1442, 1443-1447 гг.), належаў да рыцарскага ордэну Дракона. Дарэчы, сярод кавалераў гэтага ордэна быў наш Вітаўт Вялікі, кароль Польшчы Уладзіслаў (Ягайла), кароль Арагона і Неапалю Альфонс V, дэспат Сербіі Штэфан Лазарэвіч. Ад бацькі імя, ці ўжо лепей тытул, “Дракон” перайшло да сыноў, у тым ліку і да Улада Цепэша. Мянушка Цепэш паходзіць ад румынскага юеарг — п*а*ля, кол і перакладаецца як “той, хто саджае на палю”. Гэта быў спосаб пакараньня, якім Улад карыстаўся часьцей за ўсё. Саджаньне на палю прыдумаў, вядома, ня ён. Гэтае пакараньне вядомае яшчэ ад часоў старажытных германцаў. Змрочная рэпутацыя “Цепэша” прывяла да таго, што слова “Дракул” пачало асацыявацца з румынскім словам “drac” і асэнсоўвацца як “д’ябал”.

З 1442 па 1448 гг. малады Улад разам са сваім малодшым родным братам Раду (будучы ўладар Валахіі Раду Чэл Фрумос — Раду Прыгожы) былі закладнікамі ў туркаў. Тыя заслужана славіліся як храбрыя ваяры. А паколькі яны ніколі не шкадавалі свайго жыцьця, то і жыцьцё іншых у іхніх вачах не каштавала нічога. Магчыма, менавіта адтуль, з юнацкіх уражаньняў, і паходзіць ягоная бязьлітаснасьць, ад якой стыла кроў. Абодва браты зусім па-рознаму рэагавалі на жыцьцёвыя выпрабаваньні. Улад з гадоў зьняволеньня вынес нянавісьць да турак. А Раду зрабіўся каханкам султана Мехмеда II, якому жанчын-наложніц было недастаткова.

У 1448 г. бацьку Улада забілі. Хутка пасьля гэтага ён вярнуўся ў Валахію, з дапамогай адной з баярскіх груповак у кастрычніку захапіў трон, але толькі на некалькі тыдняў. З 1448 да 1456 г. Улад жыў спачатку ў Малдове, а потым у Трансільваніі.

## *2. Сучава.*

У Сучаву ўязджаем позна ўвечары, недзе пасьля дзесяці. Аўтобус высаджвае мяне аднаго і коціць далей у накірунку Канстанцы, да мора. Канчаткова вырашыўшы пытаньне з начлегам, назаўтра з раніцы пачынаю агляд гораду.

Сучава — горад адносна невялікі, можна параўнаць з нашай Гародняй. Быў адной са сталіцаў Малдовы. Дарэчы, Малдова — ня тая тэрыторыя, якая завецца цяпер Рэспублікай Малдова. Гэта толькі адна з гістарычных правінцыяў Малдовы — Бесарабія. А старажытная Малдова ўключала акрамя Бесарабіі значную паўночна-усходнюю частку Румыніі да гарадоў Брэіла, Галац і Кілія на поўдзень з выхадам да мора, на захад — цягнулася да Карпатаў, а з поўначы ўключала і

Букавіну (сучасную Чарнавіцкую вобласьць Украіны). Першай сталіцай Малдовы была Баія, потым Сірэт, цяпер невялікае мястэчка, румынскі памежны пункт на мяжы з Украінай. У 1371 г. у Сірэце было заснаванае каталіцкае біскупства.

Гаспадар Малдовы Пётр I Мушат (1375-1391 гг.), клапоцячыся пра абарону дзяржавы, будаваў замкі (Нямц, Сучава ды іншыя) і ў 1388 г. перанёс сталіцу Малдовы ў Сучаву. Дарэчы, жонкай Мушата была сястра Кейстута Рынгала.

Начытаўшыся вельмі паважанага мною сп. Уладзіміра Арлова, пачынаю ўсюды, дзе можна, шукаць беларуска-румынскія сувязі. І вось: 26 верасьня 1387 г. у Львове Пётр I Мушат дае васальную прысягу перад нашым Ягайлам. Далей. Прастору, спачатку занятую румынамі, яны самі назвалі “Цара Мунтеняска”, г. зн. “зямля, якая знаходзіцца каля гор”, а палякі — Земля Мултанска. Памятаеце дзеда Мультана ў Караткевіча? Згадваецца бард Зьміцер Бартосік і слова “ўгнаеньні”, з якога ў расейскага хлопчыка пачалася цікавасьць да беларускай мовы. Сьметніца па-румынску будзе coє de gunoi ( кош дэ гуной). Чым ня кошык для гною?

Румыны вельмі шануюць сваіх старажытных уладароў. У цэнтры Сучавы Пятру Мушату стаіць помнік. А вось помніка Леніну няма ніводнага. Ёсьць помнік Міхаю Эмінэску. Гэты геніяльны румынскі паэт, якога можна параўнаць з нашым Максімам Багдановічам, пражыў адносна нядоўгае жыцьцё. Як мне распавялі, ён вельмі любіў гулянкі і віно: малады таленавіты паэт— нічога дзіўнага. А дзе гулянкі, там і дзеўкі. Памёр Эмінэску ад пранцаў. На помніку радкі, напісаныя ў 1863 годзе, якія мне спадабаліся. Вось іх вольны пераклад:

Бадзяюся ўноч па Сучаве
Па мурох ганарлівых у славе.
Веліч тых, што калісьці жылі,
Уся прайшла — ні сьляда на зямлі.

Гаспадары — пенсіянеры, здалі мне пакой з двумя вялікімі ложкамі за 80000 lei (прыблізна 2,5 даляры). Спадар Джорджэ ўвесь час нешта майструе ў доме — пашырае плошчу. Хоча, каб дзеці і ўнукі маглі прыязджаць і было дастаткова месца ўсім. Спадарыня Ана фарбуе дзьверы. Завязваецца размова. Хутка высьвятляецца, што камуністаў мы ня любім. Як і брат майго дзеда, бацькі гаспадароў пацярпелі ад калектывізацыі пасьля другой сусьветнай вайны. Усё адабралі толькі за тое, што людзі сумленна працавалі і мелі моцную гаспадарку (хаця і ня надта вялікую). Узаемныя антыпатыі дадаюць у гаворку сардэчнасьці. Распавядаю кораценька пра нашыя рэаліі, пра рэжым, становішча з беларускай мовай, пра наш Гуманітарны ліцэй. Жанчына відавочна зьдзіўленая, спачувальна ківае галавой. Увечары, калі вяртаюся да хаты, на стале стаіць вялікая талерка з яблыкамі.

Увогуле, румыны вельмі спакойныя і ветлівыя людзі, з разьвітым пачуцьцём прыгажосьці. Гэта адлюстравана нават у мове. Выраз “гэта ня добра” ў дакладным перакладзе з румынскай гучыць як “гэта непрыгожа”.

Накіроўваюся да галоўных турыстычных славутасьцяў Сучавы — замку, рэзідэнцыі малдаўскіх гаспадароў і помніку Штэфану III Вялікаму. Да помніку з цэнтру гораду можна патрапіць толькі праз парк. Пабудаваны яшчэ за камуністычнымі часамі, помнік стаіць на даволі вялікім узгорку і ўражвае сваімі памерамі. Можна па-рознаму ставіцца да манументальнай камуністычнай скульптуры, але тут я па-добраму пазайздросьціў румынам. Вялізная стэла-пастамент, вышынёй метраў дваццаць пяць і на ёй конная статуя Штэфана. У руцэ, выцягнутай наперад і ўверх, ён трымае скіпетр. Самога Штэфана можна пабачыць толькі задраўшы ў неба галаву. Вось дзе моц і сіла! Вось дзе патрыятычнае выхаваньне! Адразу ўявіў сабе конную статую Вітаўта Вялікага на плошчы Незалежнасьці ў Менску. От добра было б! І тут жа ўспомніў помнік Леніну... Адагнаўшы паскудныя ўспаміны румынскім каньяком “Алімпус”, кручу галавой у пошуках фартэцыі. Нідзе нічога ня бачна. Недалёка грэецца на сонейку румынскі пенсіянер. Зьвяртаюся да яго. Выслухаўшы мяне,

ён пытаецца, адкуль я ведаю па-румынску. У адказ выдаю свой каронны выраз, які моцна дапамагаў у розных замежных краінах. “Калі я прыехаў у Румынію (у Балгарыю, у Францыю і г. д.), трэба паважаць румынскі (балгарскі, французкі і г. д.) народ, і таму трэба ведаць хоць колькі словаў.” “О!” — кажа румын. Потым устае і прапаноўвае паказаць шлях. Фартэцыя займае вялікую плошчу. Таўшчэзныя моцныя муры. Ад гэтай аграмадзіны патыхае веліччу. Разумееш, чаму Эмінэску прысьвяціў ёй вершы.

Ёсьць у Сучаве этнаграфічны музей у будынку былой гасьцініцы для негацыянтаў. Ёсьць музей гістарычны з добрай экспазіцыяй. Сярод іншага, у гістарычным музеі цікавая Тронная зала, дзе ў выглядзе васковых фігураў у натуральных памерах прадстаўлены Штэфан Вялікі, яго трэцяя жонка, сын Багдан, магнаты.

Штэфан ІІІ Вялікі (Штэфан Чэл Марэ) — належыць да самых паважаных у Румыніі гістарычных асобаў. Пры ім тэрыторыя Малдовы мела найвялікшыя памеры. Гэтаксама, як нашае Княства пры Вітаўце Вялікім. Штэфан любіў свой народ, мужна змагаўся з туркамі-захопнікамі і стаў героем мноства легендаў яшчэ пры жыцьці.

Уладарыць у Малдове (як і ў Валахіі) было вельмі няпроста. Дзякуючы, як пішуць румынскія вучоныя, “нашай злашчаснай сістэме насьледаваньня”, прэтэндаваць на трон маглі ня толькі сыны гаспадара, народжаныя ў законным шлюбе, але і пазашлюбныя дзеці. Нікога не цікавіла, хто была ў чарговага прэтэндэнта маці, галоўнае — хто быў бацька. Любы байструк гаспадара, абапіраючыся на падтрымку якой-небудзь баярскай групоўкі, а часта і суседзяў (Польшчы, Вугоршчыны і асабліва Турцыі), мог змагацца за трон і часта пасьпяхова дамагаўся сваёй мэты. Да румынскіх падручнікаў гісторыі звычайна прыкладаюцца храналагічныя табліцы, дзе пералічваюцца гаспадары Малдовы, Валахіі і Трансільваніі. Дык вось толькі пералік гаспадароў Малдовы з сярэдзіны XIV стагоддзя да сярэдзіны XIX стагоддзя займае тры старонкі дробнага-дробнага шрыфту. У сярэднім яны сядзелі на троне па два-тры гады, а то і меней. Часта чарговага гаспадара праганялі. Адсядзеўшыся ў суседзяў, ён зьбіраў войска, і праганяў таго, хто прагнаў яго. Той, у сваю чаргу, рабіў тое самае...

Сам Штэфан Вялікі браў шлюб пяць разоў. Быў ён, як румыны кажуць, “поўны жыцьця”, вельмі любіў гулянкі. Як сьцьвярджалі, меў каханку ледзь ня ў кожнай вёсцы. Уяўляеце, якая валтузьня вакол трону была тады ў Малдове? Штэфан Вялікі гаспадарыў сорак сем гадоў (1457-1504 гг.). Трэба было быць вельмі прадбачлівым і моцным, каб у такіх абставінах гэтак доўга ўтрымліваць трон.

У Румыніі мноства манастыроў. Згодна са старажытнай традыцыяй, гаспадары засноўвалі іх з нагоды пераможнай бітвы. А пасьля сьмерці гаспадара яго хавалі ў манастыры, кцітарам (па-сучаснаму, фундатарам) якога ён зьяўляўся.

У Сучаве захоўваюцца парэшткі Сьвятога Іаана Новага, перанесеныя ў 1402 г. з гораду Чэтаця-Албэ (зараз г. Белгарад-Днястроўскі, Украіна), дзе пакутнік быў закатаваны туркамі. Гэты сьвяты зьяўляецца духоўным патронам Малдовы.

### *3. Улад Цепэш.*

У 1456 г. з дапамогай гаспадара Трансільваніі Янаша Хуньядзі (дарэчы, таго, што загадаў забіць яго бацьку), Улад зноў захапіў трон Валахіі і гэтым разам гаспадарыў да 1462 году. Ён змог стабілізаваць унутранае і вонкавае становішча краіны. Змагаўся з баярамі за адзінства краіны, дзеля барацьбы з унутранымі і зьнешнімі ворагамі ўзброіў вольных сялянаў і месьцічаў, узмацніў дзяржаўны апарат. У 1457 г. пры яго дапамозе Штэфан, тады яшчэ не вялікі, захапіў трон Малдовы. Вясной 1459 г., спрыяючы нацыянальным купцам, абмежаваў дзеяньні замежных гандляроў на тэрыторыі княства і запатрабаваў ад іх гандляваць толькі ў памежнай зоне ў час кірмашоў, якія адбываліся некалькі разоў на год. На што купцы з Брашова і Сібіу зьдзекліва адказалі: “Мы ведаем як справы ў Валахіі — сёньня гаспадаром Улад, заўтра Дан, пась-

лязаўтра Раду, і кожны, хто прыйшоў, мяняе тое, што зрабіў папярэднік...", і свой гандаль працягвалі. У адказ Улад, які вельмі высока ставіў слова гаспадара, загадаў схапіць усіх купцоў з Брашова і Сібіу, якія ў той час знаходзіліся на тэрыторыі Валахіі, і пасадзіць іх на палю. Гэта выклікала моцную незадаволенасьць трансільванскіх купцоў, якія прафінансавалі прэтэндэнта на валашскі трон — Дана. Улад Цепэш правёў пасьпяховы карны рэйд на Брашоў і ў Трансільванію. Сотні людзей былі пасаджаныя на палі альбо спаленыя жыўцом. Прэтэндэнт Дан быў узяты ў палон, па ім жывым сьвятар прачытаў заўпакойную імшу, і Дану адрэзалі галаву.

### 4. *Брашоў.*

З Сучавы да Брашова можна даехаць на аўтобусе. Шлях няблізкі, але пераезд не падаецца доўгім. Выехаўшы раніцай, удзень я ўжо ў Трансільваніі. Так завецца паўночна-заходняя частка Румыніі.

Пасьля даволі доўгіх пошукаў усё ж знаходжу гатэль па маёй кішэні — 3 даляры за ложак у суткі. На месцы адміністратара сядзіць прыгожая маладая дзяўчынка з цудоўнымі чорнымі валасамі і зялёнымі вачыма. Знаёмімся. Высьвятляецца, што дзяўчынку завуць Ацілія. Згадваю раман Джорджэ Кэлінэску "Загадка Ацілії". Ацілія падказвае, як даехаць да цэнтру, але я вырашаю ісьці пешшу.

У Брашове цэнтральная частка гораду захавалася амаль цалкам, з часоў сярэднявечча і знаходзіцца пад аховай ЮНЭСКА. Цікавы гістарычны музей месьціцца ў самым цэнтры ў будынку былой ратушы. Старажытная BISERICA NEAGRГ (Чорная царква) атрымала сваю назву пасьля пажару ў XVII стагоддзі. Брашоў знаходзіцца недалёка ад тых усіх мясьцінаў, якія трэба наведаць: Сігішаара, замак Бран, Сінайя. Самым танным транспартам зьяўляецца цягнік. Удакладняю: на вакзале ўсё неабходнае. Паліцыянт, які, верагодна, робіць дзяжурны абход і ў гэты момант апынуўся побач, раіць мне берагчы кішэні. Дзякую і абяцаю, што буду ўважлівы.

За некалькі прыпынкаў ад цэнтру знаходзіцца царква св. Барталамея, самая старажытная царква Брашова. Менавіта каля яе Улад Цепэш саджаў на палі брашавянскіх негацыянтаў падчас свайго карнага паходу ў гэтыя мясьціны. Каля царквы знаходзіцца высокі пагорак, з якога цудоўна бачны амаль увесь горад. Думаю, ці не на гэтым пагорку баляваў Улад, бо меў звычку піць і есьці падчас экзекуцыяў.

### 5. *Улад Цепэш.*

У 1461 г. Цепэш адмовіўся плаціць даніну турэцкаму султану. Узімку 1461-1462 гг. султан паслаў да Цепэша пасла, грэка на імя Катабалінас з загадам запрасіць валашскага гаспадара ў Стамбул для аплаты даніны, абяцаючы, што пры гэтым Цепэш сустрэне выключна пачэсны прыём. У той жа час султан даў інструкцыі Гамзе-пашы, камандуючаму турэцкімі войскамі на Дунаі, каб той падтрымліваў таемную сувязь з Катабалінасам. І калі Катабалінас разам з Цепэшам пакіне Тырговіштэ і дасягне Джурджу (горад на Дунаі), трэба напасьці на іх і ўзяць Цепэша ў палон. Цепэш пра гэта даведаўся. Яго гвардзейцы, пераапрануўшыся ў турэцкую вопратку, хітрасьцю захапілі Джурджу з усім гарнізонам. У рукі Цепэша трапіў і Катабалінас са сваёй сьвітай. З усёй гэтай здабычай гаспадар Валахіі вярнуўся ў Тырговіштэ. І тут, прыблізна за пяць кіламетраў ад гораду, усе палонныя былі пасаджаныя на палю. Прычым, самыя высокія палі (як той казаў, пачэснае месца) атрымалі Катабалінас і Гамза-паша.

### 6. *Бран.*

Да замка з Брашова ходзіць аўтобус. Ехаць менш за гадзіну. Здалёк ён нагадвае кубло арла. Заснаваны ў 1378 годзе і выкарыстоўваўся як мытны пост на шляху

Брашоў-Кымпулунг. Кожны купец мусіў заплаціць 3% ад кошту свайго тавару. Замак, адносна невялікі, неаднаразова перабудоўваўся. Цяпер у ім музей.

Менавіта Бран турыстам прапануюць як замак Дракулы. Але гэта ня так. Я чуў, як гід распавядаў групе румынскіх школьнікаў, што Бран ня мае ніякага дачыненьня ні да Дракулы, ні да Цепэша. Гэта замак каралевы Марыі. Хто адпачываў у Балгарыі і наведваў Балчык, ведае пра тамтэйшы палац румынскай каралевы. Дык гэта тая самая каралева Марыя. Пасьля сьмерці Марыя загадала пахаваць сваё сэрца ў замку Бран. Зараз каля замку стаіць каплічка з сэрцам каралевы, якую паказваюць турыстам.

Але замежныя турысты ў большасьці пра гэта ня ведаюць, што і выкарыстоўваецца мясцовымі жыхарамі напоўніцу. Каля замку разьмясьціўся сувенірны рынак, дзе назвы “Дракула” і “Улад Цепэш” няма, здаецца, толькі на таварах, зьвязаных з фалічнымі матывамі.

### *7. Улад Цепэш.*

Аднак Цепэш на гэтым не супыніўся. Ён пайшоў з войскам за Дунай і захапіў усе турэцкія крэпасьці ўздоўж ракі да гораду Зімніца, рабуючы і спальваючы паселішчы, рэжучы і саджаючы на палю турэцкае насельніцтва. Задаволены зробленым, ён дасылае вугорскаму каралю Мацяшу Корвіну ліст, у якім хваліцца тым, што зрабіў. Ліст гэты, датаваны 11 лютага 1462 г., цудам захаваўся. У ім паведамляецца пра колькасьць забітых: 23884 чалавекі; і гэта без уліку тых, што былі спаленыя жыўцом!

Хаця ў лісьце і паведамляецца, што ўсе забітыя былі туркі, з цяжкасьцю верыцца, што падчас той эксьпедыцыі нехта асабліва разьбіраўся, хто турак і хто балгарын, хто мусульманін і хто хрысьціянін!

Зразумела, цярпець такое султан Мехмет II не зьбіраўся і ўлетку 1462 г. турэцкае войска (ад 60000 да 250000 чалавек) рушыла на Валахію. На сваім шляху да Тырговіштэ султан бачыў пустую краіну. Улад выкарыстоўваў тактыку, якую пазьней назавуць “тактыкай спаленай зямлі”.

Нарэшце турэцкая армія дайшла да сталіцы Валахіі. Горад быў пусты. Баючыся нейкай пасткі, султан вырашыў абмінуць Тырговіштэ. Хутка на сваім шляху туркі ўбачылі лес — палі, з напалову згнілымі шкілетамі займалі плошчу ў даўжыню да 17 стадыяў (г. зн. 3 км) і ў шырыню да 7 стадыяў (больш за 1 км). Катабалінаса і Гамзу-пашу пазналі па рэштках дарагой шоўкавай вопраткі. І было там прыблізна 20 000 чалавек: мужчыны і жанчыны, старыя і маладыя.

Гэтае відовішча выклікала ў султана сапраўдны ступар!

Вось што піша Калкокондзілас, хранікёр, які ўвесь час быў побач: “Імператар, поўны зьдзіўленьня, бесперапынна казаў, што ня можна захапіць краіну, дзе ўладарыць чалавек, які здольны на гэткія ўчынкі і здольны так выкарыстоўваць сваю дзяржаву і сваіх падданых”. І далей хранікёр дадае: “І ўсе туркі, бачачы мноства людзей, пасаджаных на палю, запалоханыя былі моцна.”

Султан вырашыў далей не перасьледаваць Цепэша, павярнуў войска ў накірунку Брэілы, а адтуль вярнуўся ў Турцыю.

### *8. Сігішаара.*

Да Сігішаары з Брашова можна даехаць цягнікам за 3 гадзіны і ў той жа дзень вярнуцца ў Брашоў.

Цягнікі ў Румыніі 3-х тыпаў: 1) персанал — як нашая электрычка. 2) рапід — як наш пасажырскі. 3) акчэлерат — як наш хуткі.

Розьніца ў хуткасьці паміж “персаналам” і “рапідам” ня вельмі вялікая, а ў кошце — амаль удвая.

Ад вакзалу накіроўваюся ў гістарычны цэнтр гораду, занесены ў сьпіс сусьветнай спадчыны. Цэнтр вельмі добра дагледжаны, крэпасьць вялізная. Падымаюся. Каля ўваходнай вежы знаходзіцца гарадскі гістарычны музей. Вежа высокая і з яе агляднай пляцоўкі бачыш увесь горад.

Уваходжу ў крэпасьць. Недалёка ад уваходу знаходзіцца трохпавярховы дом, дзе, па некаторых зьвестках, і нарадзіўся Улад Цепэш. Цяпер у доме на першым паверсе рэстаран. Натуральна, тут трэба сфатаграфавацца і выпіць куфаль піва.

Насупраць гэтага дому — лютэранская кірха, а зьлева ад яе — помнік Цепэшу. А трошкі далей — помнік вугорскаму паэту Шандару Петэфі. У ліпені 1848 г. побач з Сігішаарай, каля вёскі Альбешць, вугорская армія была разьбітая расейцамі. Падчас гэтай бітвы і загінуў паэт-рэвалюцыянер.

Па крытай чорнай лесьвіцы (помнік XV ці XVI стагоддзя) падымаюся на ўзгорак, дзе знаходзіцца лютэранская “Кірха-на-Узгорку” (Biserica-din-deal).

У Трансільваніі частка насельніцтва з нямецкімі каранямі, веравызнаньне мае лютэранскае. У параўнаньні з каталіцкімі, лютэранскія рэлігійныя пабудовы ўнутры больш сьціплыя. Гэтая мае невялічкія лёхі. Вырашаю спусьціцца ўніз, паглядзець. Насустрач падымаецца жанчына сярэдняга ўзросту. І тут адбылася першая з двух падзеяў гэтае вандроўкі, якую я буду памятаць усё жыцьцё. Жанчына кажа мне: “Keine Lampe, sehen sie nichts.” Я зразумеў, што там няма сьвятла, і я нічога не пабачу. Але, божа мой, як прыемна! Ніхто цябе не прымае за расейца!

Але спусьціўся. На самой справе — нічога ня бачна. Прыемна ўсхваляваны, выходжу з кірхі, спускаюся з узгорку і накіроўваюся да дому, дзе яшчэ раней бачыў шыльду “Палінка і віно на разьліў”.

Палінка — гэта хатняя гарэлка, якую робяць у Трансільваніі і Вугоршчыне. Гаспадыня вельмі ветлівая і прапануе пакаштаваць “палінку” трох гатункаў: з яблык, груш, сьліваў. Які духмяны пах! А смак! Словамі не перадаць! Натуральны, якасны прадукт! Пасьля ваганьняў купляю бутэльку яблычнай. Даю сабе слова прывезьці дадому і даць гэты цуд пакаштаваць жонцы. Давёз. Праўда, ня цэлую бутэльку.

Пасьля абыходжу па перыметры ўсю крэпасьць. У адным месцы стаіць група вугорскіх турыстаў. Гід ім паказвае частку гістарычнай забудовы: дом, сьцяну. Але ўвайсьці ў двор ня можна, бо вісіць шыльда: “TEREN PRIVAT”. Турысты заглядваюць, але не ўваходзяць. Зазірнуў і я. Прыемна за румынаў: у іх правы прыватнай уласнасьці паважаюць. Ня тое, што ў нас.

### 9. *Улад Цепэш.*

Хоць турэцкі паход на Валахію ў 1462 г. нельга назваць пасьпяховым, але і зусім безвыніковым ён ня быў. Мехмет II вёз у сваім абозе ў якасьці прэтэндэнта на валашскі трон роднага брата Цепэша Раду Прыгожага. Падтрыманы туркамі, Раду пасьля адыходу Мехмета пачаў дзейнічаць самастойна.

Валашскае баярства, незадаволенае цэнтралізатарскай палітыкай Цепэша, паразумелася з туркамі, выступіла супраць гаспадара і перайшло на бок Раду. Улад Цепэш адступіў і быў вымушаны адысьці ў Трансільванію, разьлічваючы на падтрымку вугорскага караля, аднак Мацяш Корвін не захацеў сварыцца з туркамі. Ён заключыў мір з Раду Прыгожым, а Цепэша загадаў арыштаваць і пасадзіць у крэпасьць. Раду Прыгожы кіраваў Валахіяй з 1462 па 1473 гады, калі яго, пры дапамозе малдаўскага гаспадара Штэфана Вялікага, зьмяніў Лайота Бесараб.

Зьняволеньне Улада цягнулася 12 гадоў, у асноўным у крэпасьці Вышаград, на Дунаі, недалёка ад Буды.

Летам 1476 г. разам з трансільванскім ваяводам Штэфанам Баторы (наш будучы вялікі князь Сьцяпан Батура), Улад дапамог Штэфану Вялікаму прагнаць з Малдовы турак.

У лістападзе 1476 г. Улад у трэці раз стаў гаспадаром Валахіі, але праз некалькі тыдняў у сьнежні быў забіты туркамі з дапамогай мясцовых баяраў. Кажуць, што адрэзаная галава Улада была пакладзена ў мёд і адпраўленая ў Стамбул турэцкаму султану.

Доўгі час лічылася, што цела Цепэша пахаванае ў манастыры Снагоў (Snagov). Аднак апошнія дасьледаваньні прымушаюць лічыць, што пахаваны ён у манастыры Комана (Comana), на поўдзень ад Бухарэсту.

Прайшлі стагоддзі.

Якое зараз стаўленьне да асобы Улада Цепэша сярод румынскіх вучоных? У асноўным яго характарызуе наступная цытата гісторыка Фларыяна Крыстэску: “Як ёсьць, ведае Бог, але мы так ведаем і так гаворым: быў гэта гаспадар люты і неўтаймаваны, што ўсяляў страх сьмерці ў гультаёў, у хлусоў, у злодзеяў, і ў ворагаў краіны, аднак такім сумленным і справядлівым, як ён, больш ніхто ня быў.”

## *10. Сінайя.*

Гэта горны курорт у 50 км на поўдзень ад Брашова. У канцы XVII стагоддзя вялікі спэтар (камандуючы кавалерыяй) Валахіі Міхаіл Кантузіно наведаў сьвятыя мясьціны, у тым ліку і гару Сінай. Вярнуўшыся дадому, ён вырашыў заснаваць манастыр, як на гары Сінай. Адсюль назва мястэчка — Сінайя. На працягу 1690-1995 гг. ішло будаўніцтва. Асабліва прыцягвае ўвагу царква манастырскага комплексу, грацыёзны манумент архітэктуры ў стылі “Брынкавяну” (гаспадара Валахіі з 1688 па 1714 гады).

Унутры, як заходзіш і направа, вісіць карціна: румынскі кароль Караль I абапіраецца на тумбу, у якой адколаты адзін вугал. Гэта азначае, што ад маці Румыніі аддзеленыя яе дзеці — Бесарабія, Букавіна, Добруджа. У гэтым сэнсе румыны адрозьніваюцца ад беларусаў. Ніхто з нас асабліва не турбуецца ад таго, што, напрыклад, Браншчына, Чарнігаўшчына, Смаленшчына калісьці былі беларускімі землямі. Няма і няма: ну і што?

А на румынскі характар наклала адбітак тое, што на працягу стагоддзяў сёньняшняя Румынія была фактычна падзеленая на 3 часткі: Валахія, Малдова, Трансільванія. Працэс аб’яднаньня ішоў доўга і балюча, аж да сьнежня 1919 г. Цяпер 1 сьнежня — нацыянальнае сьвята Румыніі. Аднак перад другой сусьветнай вайной Румынія страціла паўднёвую Добруджу (гэта частка сёньняшняй Балгарыі), потым Бесарабію (зараз Рэспубліка Малдова) і паўночную Букавіну (Чарнавіцкая вобласьць Украіны).

Сапраўдным турыстычным дыямантам Сінайі зьяўляюцца замкі Пелеш і Пелішор. Горнае паветра прывабіла сюды ў XIX стагоддзі румынскую каралеўскую сям’ю. Па загадзе першага румынскага манарха Караля I Гогенцолерна была пабудаваная летняя рэзідэнцыя — два замкі. Па архітэктурным стылі яны нагадваюць родныя Каралю I замкі паўднёвай Нямеччыны і Швейцарыі.

Паглядзець Пелеш і Пелішор прыязджае шмат турыстаў. У Румыніі, у адрозьненьне ад Балгарыі, цана білета ў музей аднолькавая як для румынаў, так і для іншаземцаў. Набыўшы білет, зьвяртаюся да жанчыны з бэйджам. “А дзе тут уваход?” Яна мне ветліва адказвае: “Для румынаў — там” — і паказвае. Мне як па сэрцу мёдам — свой! (Падзея № 2). Уваходы розныя не з нагоды нейкай дыскрымінацыі. Проста іншаземцам прыдаецца гід, які праводзіць экскурсію на зразумелай ім мове.

Ну а я, просты беларус, ужо як-небудзь разам з румынамі паслухаю.

## *11. Улад Цепэш.*

Румынскія гісторыкі падрабязна дасьледавалі той драматычны эпізод, калі вялікія баяры (магнатэрыя) княства пасьля змаганьня з туркамі разам з гаспадаром

Уладам Цепэшам, раптам пакінулі яго і перадалі трон Уладаваму брату Раду Прыгожаму.

Чаму так адбылося? Як трэба было сябе паводзіць у гэтай сітуацыі і што трэба было рабіць далей? Гісторык Нягу Джувара лічыць, што трэба было працягваць барацьбу, чаго б гэта ні каштавала. Ён, у прыватнасьці, кажа, што калі Савецкі Саюз у чэрвені 1940 г. ультыматыўна запатрабаваў ад Румыніі перадаць Бесарабію і паўночную Букавіну, лепей было б супраціўляцца, якія ні былі б наступствы. Гэтаксама памылковым ён лічыць падпісаньне сепаратнага міру з Нямеччынай і Аўстра-Вугоршчынай пад час першай сусьветнай вайны, калі Румынія апынулася паміж нямецкімі войскамі, з аднаго боку, і пагрозай бальшавізму, з другога боку.

Але вернемся ў XV стагоддзе. Чый бок меў большую рацыю — Раду Прыгожага ці Улада Цепэша? Гэтая сітуацыя здаецца мне падобнай на тую, у якую час ад часу патрапляў беларускі народ. Пакарыцца, каб выжыць, альбо змагацца, ня ведаючы, што наперадзе? Гісторыя ня ведае ўмоўнага склону. Наш народ часта выбіраў падпарадкаваньне. Адсюль абрыдлае ўжо “абы ціха” ды “каб толькі не было вайны”. Але лёс краіны і народу ніколі ня быў і ня ёсьць вызначаным канчаткова. Гісторыю робім усе мы і кожны з нас сваімі ўчынкамі.

Як складвалася сітуацыя ў Валахіі тады, увосень 1462 году? Ад хрысьціянскіх дзяржаваў Еўропы ніякай дапамогі не чакалася. Сербія, Балгарыя, Грэцыя заваяваныя туркамі і ператвораны ў пашалыкі. Ад Буды да Брашова войска тады ішло 3 месяцы, так што і на Вугоршчыну разьлічваць не выпадала. Браты-малдаване, замест дапамогі, ударылі ў сьпіну.

І калі працягваць барацьбу, як хоча Цепэш, ці ня вернецца праз пэўны час султан яшчэ з большым войскам і ці не ператворыць маленькую Валахію ў пашалык? З другога боку, Раду Прыгожы з той жа дынастыі, сябар султана. А ўмовы: саступіць крэпасьці па Дунаю (дык яны і так у руках турак), ды даніна 10000 залатых у год. А краіна застаецца са сваімі дзяржаўнымі інстытутамі, баярствам, царквою. Туркі ня маюць права сяліцца і набываць маёмасьць у Валахіі. Ці не было рашэньне саступіць султану больш разумным?

Але парадокс сітуацыі ў тым, што, калі б не было ўпартага супраціву туркам з боку Улада Цепэша, ніякі кампраміс між султанам, Раду і баярствам быў бы немагчымым. Гераізм супраціву ці дыпламатыя падпарадкаванасьці? Гэта была тая дылема, якая паўставала перад кіруючым класам Валахіі на працягу ўсяго Сярэднявечча.

Да таго ці не паўплывала на рашэньне баярства пагроза сапраўднага тэрору, які выкарыстоўваў у адносінах з імі Цепэш? Ніхто ня мог быць застрахаваны ад таго, што ў любы час па аднаму толькі капрызу гаспадара ён і яго сям'я будуць аддадзеныя кату і ўзьдзетыя на палю. Без суда і бяз літасьці.

І якая тут мараль? А мараль у тым, што ня можа нарадзіцца сяброўства і таварыства праз тэрор.

## *12. Тырговіштэ.*

Цягніком дабрацца да гораду, які быў сталіцай Валахіі і дзе знаходзілася адна з рэзідэнцыяў Улада Цепэша, можна толькі з перасадкай. Таму з Брашова еду да Плоіешць, а адтуль “з аказіяй” да Тырговіштэ. З аказіяй — гэта на папутнай машыне, хутка і танна. Кіроўца давозіць мяне да самога музейнага комплексу — былога гаспадарскага двара. Ад яго цалкам захавалася толькі вежа, старанна адрэстаўраваная. Ад замка засталіся муры. Але румыны здолелі зрабіць з гэтага турыстычную цукерку. Усё дагледжана, зробленыя ходнікі. У рэзідэнцыі знаходзіўся яшчэ паракліс (палацавая царква), гаспадарчыя забудовы. На вежы вартавыя ўвесь час сачылі, ці не набліжаецца вораг. Усё

гэта было агароджана валам і рвом. Вакол рэзідэнцыі — вялізны парк. У вежы музейная экспазіцыя. А вось помніка Цепэшу няма.

У нас падобную турыстычную адметнасьць можна было б зрабіць у Крэве. Я ўжо не кажу пра Лідскі замак.

### *13. Улад Цепэш.*

Старажытныя хронікі данесьлі да нас даволі шмат гісторыяў пра ўчынкі Цепэша. Некаторыя з іх пацьвярджаюцца гістарычнымі крыніцамі, некаторыя відавочна прыдуманыя. Вось адна з гісторыяў, якая мне вельмі падабаецца і якую я раіў бы добра ведаць усім нашым бізнэсоўцам.

Улад негацыянтаў паважаў, разумеючы важнасьць гандлю для разьвіцьця краіны. Яму і ў галаву б не прыйшло абзываць іх “ушывымі блохамі”. Купец з Трансільваніі ехаў гандляваць з таварам і грашыма. Калі ён прыбыў у Тырговіштэ, сталіцу Валахіі, дык быў абакрадзены на суму 160 дукатаў, вялізныя па тых часах грошы. Гандляр прыйшоў са скаргай да ўладара. Цепэш загадаў аб’явіць насельніцтву гораду, што, калі злодзея ня выдадуць за суткі і ня вернуць гандляру ягоныя грошы, то кожны дзясяты жыхар будзе пасаджаны на палю. Паколькі ён слова сваё заўсёды стрымліваў, дык на наступны дзень злодзея даставілі ў палац і грошы прынесьлі таксама. Злодзей быў пасаджаны на палю, а да 160 дукатаў Улад загадаў дабавіць 1 дукат ад сябе. Купец, атрымаўшы ўсю сваю маёмасьць, прыйшоў у палац падзякаваць. Цепэш запытаў, ці ўсё яму вярнулі. “Усё, твая вялікасьць,— адказаў той,— і нават адзін дукат лішні. Вось ён”. Цепэш пасьмяяўся і кажа: “Ты сумленны чалавек, і добра, што сказаў пра лішні дукат, а то сядзеў бы на палі побач са злодзеем.”

Адна з гісторыяў распавядае, як Цепэш вырашыў вычысьціць краіну ад злодзеяў, лайдакоў, хворых калекаў, якія бадзяліся па дарогах краіны. Ён лічыў іх баластам — не працуюць, карысьці ад іх ніякай.

Аднойчы ўсіх іх запрасілі ў Тырговіштэ, і гаспадар запытаў: “Жадаеце, каб я зрабіў так, што вы ня будзеце мець клопатў на гэтым сьвеце і ні ў чым у вас ня будзе недахопу?” “Жадаем!” — адказалі тыя. Іх пераапранулі ў чыстую прыгожую вопратку, прывялі ў вялізны дом, дзе былі падрыхтаваныя сталы з ежай і напоямі. Пасьля таго, як небаракі наеліся і напіліся, дзьверы зачынілі і будынак падпалілі з чатырох бакоў. Усе ўнутры згарэлі.

Жанчыны, якія здраджвалі мужам, альбо дзяўчыны ці ўдовы, якія мелі сувязь з мужчынамі бяз шлюбу, караліся жудаснай карай: ім зьдзіралі скуру з грудзей, потым распалены да чырвані брус зьнізу ўтыкалі ў цела так, каб ён выходзіў праз рот, і ў такім выглядзе выстаўлялі, каб бачылі ўсе.

Цепэш меў звычку выпіваць і закусваць пад трупамі людзей, пасаджанымі на палі. Адзін з яго набліжаных увесь час зморшчваў нос ад смуроду. Тады гаспадар загадаў падрыхтаваць палю вышэйшую і пасадзіць на яе гэтага чалавека: маўляў, там смуроду не адчуе.

Адна з румынскіх народных аповесьцяў распавядае, што румынскі ваяр-выведнік патрапіў у палон да турак. Яго распытвалі, дзе Цепэш. Прывялі да султана. Маўчыць. Султан пагражаў яму сьмерцю на палі. Румын адказвае: “Калі мяне гаспадар пасылаў, то паказаў мне доўгую палю і сказаў, што калі ў турак я скажу хоць слова, на гэтай палі будуць мой бацька, жонка і чатыры дачкі. Так што лепей я памру на тваёй маленькай, з гонарам за сваю краіну!”

Як бачым, ідэя гераізму, падмацаванага запалохваньнем, не прыдумка бальшавікоў і нарадзілася значна раней. “Матросавы” былі і ў XV стагоддзі.

### *14. Плошчы.*

Вяртаюся сюды пад вечар. Музеі, на жаль, усе ўжо зачыненыя. Цягнік на Канстанцу адыходзіць апоўначы. Накіроўваюся ў цэнтр. Нафтавая сталіца Румыніі — сучасны еўрапейскі горад. Сярод помнікаў маю ўвагу прыцягнуў невялікі манумент, прысьвечаны памяці загінуўшых у сьнежні 1989 г. падчас паўстаньня супраць камуністычнага рэжыму.

Тады на цэнтральнай плошчы на мітынг сабраўся народ, былі хваляваньні, не абышлося без ахвяраў. Імёны загінуўшых пазначаныя на стэле...

Добра, што мы незалежнасьць атрымалі без ахвяраў. Але можа быць таму так лёгка і дазволілі перахапіць уладу іншым? Можа быць, чалавек цэніць толькі тое, за што дорага заплаціў?

### *15. Улад Цепэш.*

Па загадзе Цепэша людзей саджалі ў кацёл, накрывалі крышкай з дзіркамі, адкуль маглі тарчаць толькі галовы, а зьнізу распальвалі агонь.

Саджалі на адну і тую ж палю жанчын з іхнімі немаўлятамі.

Аднойчы Цепэш загадаў цыганам павесіць аднаго з іх, які быў вінаваты ў крадзяжах. Тыя не хацелі гэта рабіць — закон іхні не дазваляе. Тады цыгана зварылі ў катле і яго таварышы вымушаныя былі яго зьесьці.

Быў у Валахіі сьвятар – балбатун і вельмі ласы на падарункі. Неаднойчы казаў ён людзям, што красьці вельмі дрэнна і гэта недаравальна. Цепэш запрасіў яго на сумесную вячэру. Пачалі есьці, Цепэш пакрышыў хлеб на дробныя кавалачкі. Потым пра нешта запытаў манаха. Той, адказваючы, па неабачлівасьці, узяў некалькі крыхаў з таго кавалку, што накрышыў гаспадар.

Цепэш пытае, ці праўда тое, што кажа сьвятар падчас імшы. “Твая вялікасьць, гэта праўда”,— адказвае сьвятар. “Тады чаму ты ўзяў мой хлеб, які я раскрышыў для сябе?” І загадаў пасадзіць таго на палю.

Цепэш пасадзіў на палю 500 (сумнеўна нешта?) баяраў, бо ні адзін з іх ня ведаў дакладнага адказу на пытаньне, колькі гаспадароў яны памятаюць з гісторыі Валахіі. Адны адказалі — 50, іншыя — 20 ці 30, але ні адзін не адказаў, як хацеў Цепэш, а менавіта 7. (Тут, верагодна, меліся на ўвазе толькі яго прамыя папярэднікі: бацька, дзед і г. д. З цікавасьці я іх падлічыў: і на самой справе, уключаючы самога Цепэша, дакладна 7).

Цепэш загадаў адрэзаць галовы некалькім баярам і гэтыя галовы выкарыстаў для корму ракам. Затым запрасіў сяброў гэтых баяраў на абед і пачаставаў ракамі, сказаўшы: вось вы ясьцё галовы вашых сяброў.

Ёсьць аповесьць пра манаха, які вандраваў на асьле. Дык Цепэш за нейкую віну загадаў пасадзіць на палю і яго, і асла.

Аднойчы да яго прыбылі турэцкія паслы. Падчас прыёму яны не зьнялі свае цюрбаны. На пытаньне Улада, чаму яны ў цюрбанах, паслы адказалі, што гэта іх звычай і свае цюрбаны яны не здымаюць нават перад султанам. “Трэба паважаць звычаі чужой краіны”, — адзначыў Улад і загадаў прыбіць цюрбаны да галоў паслоў цьвікамі. Што і было тут жа выканана.

А гэтая гісторыя зьвязаная з крэпасьцю Поенар (Poenari).

Аднойчы на Вялікдзень вялікая колькасьць баяр з сем’ямі сабралася святкаваць. Улада на той момант ў Тырговіштэ не было. Ці думалі тыя баяры нешта дрэннае супраць Цепэша, ці не, зараз адказаць цяжка. Але падчас сьвяткаваньня ён з’явіўся і загадаў усім як ёсьць, у сьвяточнай вопратцы, адправіцца ў крэпасьць Поенар і за паўгоду адрамантаваць яе. Калі ня здолеюць, будуць пакараныя. Праз паўгоду загад быў выкананы. Але далёка ня ўсе будаўнікі змаглі вярнуцца дахаты.

### *16. Раман “Дракула” Брэма Стокера.*

Уладу Цепэшу так і не дазволілі спакойна ляжаць у зямлі. Другарадны ангельскі раманіст Брэм (Абрахам) Стокер (1847-1912 гг.) у канцы XIX стагоддзя напісаў раман, які выклікаў у сьвеце сапраўдную дракуламанію. Стокер ня вельмі разьбіраўся ў гісторыі, і ягоны герой ня мае нічога агульнага з гістарычным персанажам Уладам Цепэшам.

Нават слова “вампір”, зараз інтэрнацыянальнае, з паходжаньня сербскае. З часу напісаньня рамана (1897 г.) зьявілася і шмат фільмаў, у якіх Дракула ператварыўся ў элегантна-змрочнага арыстакрата-крывасмока з занадта доўгімі зубамі.

На заканчэньне хачу прывесьці вялікую (даруйце!) цытату румынскага гісторыка: “Аднак мяне непакоіць думка, што ў нас знайшліся службоўцы, якія лічаць, што могуць выкарыстоўваць “дракуламанію” дзеля прыцягваньня турыстаў у нашую краіну, распавядаючы ўсім і кожнаму пра сапраўднага Дракулу, ваяводу нашага Улада Цепэша, і паказваючы месцы, дзе ён ніколі ня быў. І зараз гаворыцца — вай! — пра пабудову чагосьці кшталту “Disney Land” Дракулы! Вельмі сорамна гуляць такім чынам са сваёй гісторыяй.

Нічога добрага, нічога трывалага нідзе і ніколі не пабудуеш на хлусьні.

Ня можна жартаваць з гістарычнага персанажу, які, са сваёй жорсткасьцю, але і з непараўнальнай сваёй мужнасьцю, ёсьць частка мінулага нашага народу”.

Па апошніх зьвестках, урад Румыніі адмовіўся ад пабудовы “Парка Дракулы”.

Дык хто ж такі Улад Цепэш?

Нацыянальны герой ці адзін з найвялікшых садыстаў сьвету?

У Румыніі ёсьць што паглядзець. Як кажа рэклама — “Румынія не далей і не даражэй за Крым”.

На самой справе, магу пацьвердзіць з асабістага вопыту, там можна цікава і танна адпачыць. Адно, чаго мне ўвесь час бракавала — невялікай прыстойнай беларускай кампаніі.

Нядаўна ў нашай сям’і здарылася няшчасьце — жонка разьбіла мой кубак з выяваю Улада Цепэша. Мабыць, наканавана мне ў наступным годзе зноў ехаць у Румынію.

А інакш як і з чаго я буду піць гарбату?